Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
___________ Д.В. Герасімёнак
«25» ____09____ 2025 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________ Ю.М. Галкоўская
«23» ____09____ 2025 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# МУЗЕІ БЕЛАРУСІ

для спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Складальнік: Лупашка І.Г., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат культуралогіі, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый

«23» ___09___2025 г., пратакол № 1

Рэцэнзенты:

*Навукова-метадычны савет установы “Музей “Замкавы комплекс “Мір”;*

*Ю. В. Кавалёва, вучоны сакратар дзяржаўнай установы “Музей гісторыі горада Мінска”, кандыдат культуралогіі*

Разгледжана і абмеркавана на пасяджэнні кафедры гісторыка-культурнай спадчыны
(пратакол ад 29.08.2025 № 1)

ЗМЕСТ


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 7
2.1 План-канспект лекцый 7
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 20
3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 20
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 26
4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў 26
4.2 Пытанні да экзамена 26
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вуэбнай дзейнасці студэнтаў 28
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 31
5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны 31
5.2 Асноўная літаратура 32
5.3 Дадатковая літаратура 32

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна–метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Музеі Беларусі» для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» распрацаваны на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Рэгістрацыйны нумар 6-05-03-29/23 вуч.ад 15.02.2023 г.

Музейная сетка Беларусі мае трывалыя традыцыі, якія сфарміраваліся яшчэ ў папярэднія стагоддзі. Станаўленне і дзейнасць музеяў цесна звязана з асаблівасцямі гістарычнага працэсу, што разгортваўся на беларускіх землях. Роля музейных устаноў у развіцці сучаснага грамацтва не абмяжоўваецца толькі рамкамі культурнага развіцця краіны, а выходзіць далёка за іх межы. Авалоданне тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі ў рэчышчы вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» робяць яе надзвычай актуальнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Прадметам вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» з’яўляюцца праблематыка гісторыі развіцця музейнай справы ў Беларусі, працэс фарміравання музейнай сеткі краіны, зборы дзяржаўных і прыватных музеяў Беларусі, дзяржаўная музейная палітыка, асноўныя накірункі дзейнасці і перспектывы развіцця беларускіх музеяў, музейныя арганізацыі і нацыянальнае музейнае заканадаўства.

Вызначальнай *мэтай* выкладання вучэбнай дысцыпліны з’ўляецца вывучэнне студэнтамі сучаснага стану музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь, асноўных кірункаў дзейнасці беларускіх музеяў і іх перспектыў.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» прадугледжвае вырашэнне шэрагу *задач*:

– прасачыць на фактычным матэрыяле асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускіх музеяў;

– выявіць характэрныя тэндэнцыі і асаблівасці арганізацыі музейнай справы ў Беларусі на сучасным этапе;

– вызначыць уплыў сацыяльна-эканамічнага, унутрыпалітычнага і культурнага развіцця на сучасны стан і дзейнасць музеяў Беларусі;

– сфарміраваць уяўленне аб музеі як сацыякультурным інстытуце;

– разгледзець айчынную практыку падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– асноўныя этапы развіцця музейнага будаўніцтва ў Беларусі;
– асноўныя кірункі дзяржаўнай музейнай палітыкі;
– структуру музейнай сеткі РэспублікіБеларусь;
– сучасны стан музеяў і музейнай справы Беларусі;
– асноўныя кірункі і дасягненні ў музейным будаўніцтве на сучасным этапе;
– ролю музеяў у развіцці культуры краіны.

Студэнты павінны *ўмець*:

– аналізаваць крыніцы і літаратуру па гісторыі музейнай справы ў Беларусі;
– даць характарытыку беларускай музейнай сеткі;
– аналізаваць гісторыю стварэння і вопыт дзейнасці асобных музеяў, склад іх калекцый;
– вызначаць месца і ролю музеяў у культурным жыцці асобных рэгіёнаў.

Студэнты павінны *валодаць:*

– прафесійнымі навыкамі ў аналізе і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў музеяў Беларусі;
– стварэннем інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме курса;
– навыкамі музейнай кампаратывістыкі.

Вучэбна-метадычны комплекс вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» распрацаваны з улікам пастаўленых задач, адпавядае вучэбнай праграме «Музеі Беларусі» і ўзгоднены з праграмамі вучэбных дысцыплін «Гісторыя музейнай справы», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», «Ахова гісторыка-культурнай справы» і інш.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Актывізацыі самастойнай работы студэнтаў у накірунку пошуку і выкарыстання ведаў, атрымання самастойнага вопыта вырашэння задач садзейнічаюць такія дзейсныя педагагічныя методыкі і тэхналогіі, як:

- гісторыка-тэматычны падыход;

- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.)
- метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый:

– аналізаваць сучасны стан музейных устаноў Беларусі і замежжа, ацэньваць перспектывы іх далейшага развіцця, у тым ліку ў сувязі з суб’ектамі турыстычнай індустрыі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Музеі Беларусі» прадугледжана 116 гадзін, з іх 56 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторныз гадзін па відах заняткаў: лекцый – 30 гадзін, семінарскіх заняткаў – 26 гадзін.

Рэкамендаванай формай бягучага кантролю ведаў студэнтаў з’яўляецца праверка заданняў align рознага тыпу, якія выконваюцца ў межах семінарскіх заняткаў (вуснае апытанне, праверка выкананых заданняў). Рэкамендаванай формай прамежкавага кантролю ведаў студэнтаў з’яўляецца экзамен.

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

Уводзіны. Асновы заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы музейнай дзейнасці і аховы гисторыка-культурнай спадчыны

Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў Беларусі (1918 – па сённяшні час).

Асноўныя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у галіне аховы культурнай спадчыны і музейнай справы: Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», 1996 г.; 2005 г.; Палажэнне аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь, 2006 г.; Закон Рэспублікі Беларусь 9 студзеня 2006 г. № 98-З «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»; Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, 2016.

Парадак арганізацыі і ліквідацыі музейных установ у Рэспубліцы Беларусь.

Музейны фонд Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўны каталог Музейнага фонда Рэспублікі Беларусь.

Тэма 1 Музейная сетка Рэспублікі Беларусь. Тыпалогія і прафілізацыя музеяў

Агульная характарыстыка музейнай сеткі Беларусі на сучасным этапе. Сістэматызацыя і класіфікацыя музеяў Беларусі (па розных класіфікацыйных прыкметах). Профілі музеяў (гістарычныя, мастацкія, літаратурныя, прыродазнаўчыя, навукова-тэхнічныя, комлексныя). Тыпы музеяў па роду дзейнасці і адраснай скіраванасці (навукова-даследчыя, навукова-асветніцкія (масавыя), вучэбныя, дзіцячыя). Сістэматызацыя па тыпу захоўваемай спадчыны (калекцыйныя, ансамблевыя, асяродкавыя, жывыя). Сістэматызацыя музеяў па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыкмеце.

Дзяржаўныя і прыватныя музеі. Музеі міністэрстваў і ведамстваў (музеі ўстаноў сярэдняй і вышэйшай адукацыі, экспазіцыі Музейнага фонда Нацыянальнага Банка Рэспублікі Беларусь, Музея пажарнай і аварыйна-выратавальнай справы Навукова-даследчага інстытута пажарнай бяспекі і пытанняў надзвычайных сітуацый Міністэрства надзвычайных становішчаў Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага музея войск Міністэрства унутраных спраў, Анатамічнага музея пры Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, Музея гісторыі медыцыны і інш.).

Тэма 2 Гістарычныя і комплексныя музеі (агульны агляд). Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь

Агульная характарыстыка сеткі гістарычных і комлексных музеяў Беларусі.

Этапы развіцця Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Гістарычны экскурс. Пастанова Часовага рабоча-сялянскага ўраду ў Мінску аб стварэнні Абласнога музея (20.01.1919). Структура музея. Страты музея пад час савецка-польскай вайны (1919–1920).

Беларускі дзяржаўны музей (БДМ) (1923). Аддзелы музея. Дзейнасць П.В. Харламповіча, В.Ю. Ластоўскага. Стварэнне аб'яднанай сеткі музеяў краіны на чале з Белдзяржмузеям (1924). Дзяржаўная палітыка «беларусізацыі» і яе ўздзеянне на развіццё музея. Наданне музею новай назвы – Беларускі дзяржаўны культурна-гістарычны музей (1928). Страты БДМ у канцы 1920–1930 гг. у сувязі з правядзеннем рэпрэсіўных дзеянняў у дачыненні да дзеячоў навукі і культуры краіны. Продаж на ўнутраных і міжнародных аўкцыёнах музейных каштоўнасцяў. Перайменаванне БДМ у Мінскі сацыяльна-гістарычны музей (1930).

Спыненне работы БДМ у сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнасць у акупіраваным Мінску Гістарычнага музея (1941–1944). Страты музея пад час вайны.

Распараджэнне СМ БССР «Аб арганізацыйнай групе па стварэнні Дзяржаўнага музея БССР» (1956). Адкрыццё Дзяржаўнага музея БССР (1967). Музейныя аддзелы. Стварэнне Савета па рэстаўрацыі і кансервацыі (1983). Дзяржаўны музей БССР – буйнейшы метадычны цэнтр па музейнай і гісторыка-краязнаўчай рабоце ў Беларусі.

Рэарганізацыя музея, змена профіля і наданне новай назвы – Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі (1992). Стварэнне новай экспазіцыі, правядзенне часовых выстаў.

Нацынальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (2011). Калекцыі музея – археалогіі, нумізматыкі, беларускага народнага строю канца XIX – пачатку XX ст., зброі XII–XX стст., рукапісных кніг XVI–XVIII стст., старадрукаў на еўрапейскіх мовах XVI–XVIII стст., паштовак к. XIX – пач. XX ст., беларускай народнай керамікі, беларускага мастацкага шкла, музычных інструментаў і інш.

Асноўныя кірункі дзейнасці музея. Сучасная экспазіцыя музея.

Філіялы музея – Музей I з'езда РСДРП /г. Мінск/ (1992), Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці /г.Мінск/ (2012), Музей гісторыі беларускага кіно /г. Мінск/ (2014), Музей гісторыі тэатральнай і музычнай

культуры Беларусі /г. Мінск/ (2014), Музей прыроды і экалогіі Беларусі /г. Мінск/ (2014).

Тэма 3 Абласныя краязнаўчыя музеі

*Мінскі абласны краязнаўчы музей* (г. Маладзечна).

Заснаванне Маладзечанскага абласнога музея (1959). Перайменаванне музея ў Мінскі абласны краязнаўчы музей (1964).

Дзейнасць Г.А. Каханоўскага.

Перабудовы экспазіцыі ў 1970–1990-я гг.

Паступленне ў фонды музея матэрыялаў археалагічных даследаванняў Мінскай вобласці.

Асноўныя кірункі дзейнасці музея.

Выставачная дзейнасць.

Калекцыі музея – археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, пісьмовых крыніц, керамікі, драўлянай скульптуры, музычных інструментаў, асабістых рэчаў і прыжыццёвых выданняў беларускіх дзеячоў навукі і культуры і інш.

Сучасная экспазіцыя музея.

*Брэсцкі абласны краязнаўчы музей.*

Заснаванне (1945) і адкрыццё (1957) Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.

Калекцыі музея – археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, мастацкая, старадрукаў і рукапісных кнігі, музычных інстументаў, зброі XVI–XVIII стст., мінералаў, горных парод, плакатаў Першай Сусветнай і грамадзянскай войн, матэрыялаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Стацыянарныя экспазіцыі – «Гісторыя Брэстчыны са старажытных часоў да пачатку XXI стагоддзя», «Родная прырода».

Філіялы музея – «Камянецкая вежа» /г. Камянец/ (1960), Археалагічны музей «Бярэсце» (1972), «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» /г. Брэст/ (1989), Мастацкі музей /г. Брэст/, (2002).

*Віцебскі абласны краязнаўчы музей.*

Заснаванне і адкрыццё (1918) Віцебскага гісторыка-археалагічнага музея. Сварэнне фондаў музея на базе калекцый А.Р. Брадоўскага, В.П. Федаровіча, збораў Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея, музея Віленскага вайсковага сходу, музея Віцебскай вучонай архіўнай камісіі і інш. Дзейнасць А.Р. Брадоўскага, Я.І. Васілевіча. Перадача музею будынка гарадской ратушы (1924). Стварэнне на базе Віцебскага гісторыка-археалагічнага музея Віцебскага аддзялення БДМ (1924-1928). Музейныя аддзелы ў канцы 1920-х гг. Наданне музею новых назваў – Беларускі

дзяржаўны культурна-гістарычны музей (1928), Віцебскі сацыяльна-гістарычны музей (1932). Адкрыццё філіяла музея – Антырэлігійнага музея ў Антоніеўскім касцёле (1940). Спыненне дзейнасці і страты музея пад час Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне дзейнасці музея пад назвай Віцебскі абласны краязнаўчы музей (1944). Стварэнне экспазіцыі музея. Выставачная дзейнасць музея.

Калекцыі музея – археалогіі, нумізматыкі, старадрукаў, зброі, пісьмовых крыніц і фотадакументаў і інш.

Асвятленне ў экспазіцыі музея гісторыі Віцебска IX–XIV стст.

Філіялы музея – Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Здраўнёва» /Віцебскі р-н/ (1988), Мастацкі музей /г. Віцебск/ (1992), Музей гісторыі прыватнага калекцыянавання /г. Віцебск/ (1992). Экспазіцыя «Памяці патрыётаў Віцебшчыны».

*Магілёўскі абласны краязнаўчы музей ім. Е.Р.Раманава.*

Заснаванне Дзяржаўнага гістарычнага музея пралетарскай культуры (1919) на базе фондаў музея Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта і Магілёўскага царкоўна-археалагічнага музея. Пераўтварэнне музея ў Магілёўскае аддзяленне БДМ (1924–1928). Набыццё музеям самастойнасці і новай назвы – Беларускі Дзяржаўны Акруговы краязнаўчы музей (1928). Музейныя аддзелы ў канцы 1920-х гг. Спыненне дзейнасці і страты музея пад час Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне работы музея як Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея (1944).

Фондавая, экспазіцыйная, навукова-даследчая, навукова-асветніцкая работа музея. Калекцыі музея – археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, прыродазнаўчая, кніг магілёўскай тыпаграфіі XVII–XVIII, жывапісу XVIII–XX стст., перыядычнага друку, матэрыялаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Сучасная экспазіцыя музея.

Філіялы музея – Музей Музей славы Магілеўшчыны, Мастацкі музей П.У. Масленнікава, Мастацкі музей імя В.К. Бялыніцкага-Бірулі ў г. Бялынічы.

Тэма 4 Гомельскі палацава-паркавы ансамбль

Гісторыя Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Збіральніцкая і калекцыянерская дзейнасць М.П. Румянцава, І.Ф. Паскевіча, Ф.І. Паскевіча.

Заснаванне і адкрыццё мастацка-гістарычнага музея імя А.В. Луначарскага (1919). Стварэнне на базе Гомельскага мастацка-гістарычнага музея імя А.В. Луначарскага Гомельскага аддзялення БДМ

(1924-1928). Наданне музею самастойнасці і новай назвы – Беларускі дзяржаўны мастацка-культурны музей (1928). Музейныя аддзелы ў канцы 1920-х гг.

Спыненне дзейнасці і страты музея пад час Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне работы музея пад назвай музей краязнаўства (1944), Дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей (1945), Гомельскі абласны краязнаўчы музей (1952). Адкрыццё экспазыцыі музея (1946). Экспазіцыйная работа музея ў 1950-1970-е гг. Работа па арганізацыі адкрытага захавання фондаў у аддзеле музея – Палацы Халецкіх (1980) у в. Хальч Веткаўскага р-на. Поўная перадача палаца Паскевічаў-Румянцавых (1996) Гомельскаму абласному краязнаўчаму музею. Адкрыццё мастацкага раздзела экспазіцыі ў «Паляўнічым доміку» (1997). Адкрыццё новай экспазіцыі (2003-2004).

Рэарганізацыя Гомельскага абласнога краязнаўчага музея (2006). Перайменаванне ўстановы «Музей Гомельскі палацава-паркавы ансамбль» у Дзяржаўную гісторыка-культурную ўстанову «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль» (2006).

Выставачная дзейнасць музея.

Калекцыі музея – збор прадметаў з калекцыі Паскевічаў, археалогіі, нумізматыкі, сфрагістыкі, фалерыстычная, мастацкая, прыродазнаўчая і інш.

Тэма 5 Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей

Заснаванне і адкрыццё Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея (1922). Традыцыі музейнай справы ў Гродна (дзейнасць А. Тызенгаўза, Ж.Э. Жылібера, Музей прыроды С. Жыўны). Дзейнасць Ю. Ядкоўскага. Перадача музею Старога замку (1924). Стварэнне новай музейнай экспазіцыі (1939–1941). Спыненне дзейнасці і страты музея пад час Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне работы музея як Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (1945). Дзейнасць музея па камплектаванню фондаў, стварэнню экспазіцыі, папулярызацыі збораў, выхаваўча-асветніцкая дзейнасць.

Калекцыі музея – археалогіі, нумізматыкі, абразоў XVII–XIX стст., «Нёманскае шкло» XIX–XX стст., вайсковага рыштунка, зброі, старадрукаў.

Асвятленне ў экспазіцыі музея гісторыі і культуры Гродзеншчыны, старажытных помнікаў Панямоння і інш.

Размяшчэнне экспазіцыі музея ў Каралеўскім палацы XVI ст. (Старым замку), Каралеўскім палацы XVIII ст. (Новым замку), доме рамесніка XVIII ст. (музей гісторыі Гарадніцы).

Філіялы музея: Музей М.Багдановіча, /г. Гродна/ (1986), Музей гісторыі Гарадніцы /г. Гродна/ (1994).

Тэма 6 Раённыя краязнаўчыя музеі

Агульная характарыстыка сеткі раённых краязнаўчых музеяў Беларусі. Раённыя краязнаўчыя музеі як найбольш масавая група музеяў.

Асноўныя этапы стварэння сеткі раённых краязнаўчых музеяў Беларусі.

Спецыфіка раённых краязнаўчых музеяў (комплексны характар; дакументаванне і папулярызацыя розных бакоў жыцця канкрэтнага адміністарацыйнага рэгіёна; актыўнае ўзаемадзеянне з мясцовай супольнасцю).

Асноўныя кірункі дзейнасці раённых краязнаўчых музеяў. Навукова-фондавая дзейнасць. Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць. Культурна-асветная дзейнасць. Навукова-даследчая дзейнасць.

Тэма 7 Ваенна-гістарычныя музеі і мемарыяльныя комплексы

Агульная характарыстыка ваенна-гістарычных музеяў і мемарыяльных комплексаў Рэспублікі Беларусь.

*Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.* Гісторыя стварэння Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнасць Рэспубліканскай камісіі па збору дакументаў і матэрыялаў аб Вялікай Айчыннай вайне (1942). Правядзенне ў Дзяржаўным гістарычным музеі (Масква) выставы «Беларусь жыве. Беларусь змагаецца. Беларусь была і будзе савецкай» (1942/43).

Заснаванне (1943) і адкрыццё (1944) Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Першая стацыянарная экспазіцыя (1947) – асвятленне падзей Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, вызвалення Беларусі, аднаўлення народнай гаспадаркі і культуры. Стварэнне і адкрыццё экспазіцыі ў новым будынку музея (1966).

Перабудова экспазіцыі ў 1990-х гг. – асвятленне асноўных этапаў Вялікай Айчыннай вайны, падзей 1941 – 45 гг. на тэрыторыі Беларусі. Асноўныя тэмы – гісторыя беларускага народу ў Вялікай Айчыннай вайне; падзеі на акупіраванай тэрыторыі; удзел Беларусі і яе ўраджэнцаў у баях на франтах і ў тыле ворага. Спецыяльная пляцоўка з узорамі ваеннай тэхнікі і ўзбраення Чырвонай Арміі часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Новы будынак і сучасная экспазіцыя музея (2014).

Калекцыі музея – пісьмовых крыніц і кінафотадакументаў, баявых ўзнагарод, баявых сцягаў, вайсковай амуніцыі часоў Другой сусветнай вайны, партызанскіх рукапісных часопісаў і баявых лісткоў, франтавых і партызанскіх малюнкаў, самаробнай партызанскай зброі, уласных рэчаў ўдзельнікаў ваенных падзей і інш.

Філіялы музея – мемарыяльны комплекс «Помнік воінам-інтэрнацыяналістам» /г. Мінск/ (1996), ваенна-гістарычны комплекс «Старая граница» (Дзяржынскі р-н).

Рэгіянальныя ваенна-гістарычныя музеі. Агульны агляд.

Гомельскі абласны музей ваеннай славы (2004). Адлюстраванне падзей ваеннай гісторыі Гомельшчыны ад старажытнасці да сучаснасці. Філіял – Музей крыміналістыкі (2010).

Віцебскі гарадскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Стварэнне (1992) і адкрыццё стацыянарнай экспазіцыі (1996). Выставачная дзейнасць.

Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П.І. Баграціёна. Гісторыя стварэння і дзейнасць.

Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.В. Суворава.

«Музей бітвы за Днепр» (Лоеў). Іншыя музеі.

*Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць – герой»*. Гісторыя стварэння і дзейнасць. Адкрыццё музея абароны Брэсцкай крэпасці (1956). Правядзенне творчых конкурсаў і стварэнне мемарыяльнага комплекса. Аб’яднанне мемарыяльнага комплекса і музея абароны Брэсцкай крэпасці ў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» (1971). Асноўныя экспазіцыі музея. Філіял – «Музей 5 форт» (1999).

*Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь»*. Рашэнне ЦК КПБ аб стварэнні ў Лагойскім раёне мемарыяльнага комплексу «Хатынь» (1966). Адкрыццё мемарыяльнага комплексу (1969). Стварэнне новай музейнай экспазіцыі (2023).

Філіялы – мемарыяльны комплекс «Курган славы», мемарыяльны комплекс «Дальва».

Іншыя мемарыяльныя комплексы.

Тэма 8 Музеі-запаведнікі. Музей «Замкавы комплекс «Мір»

*Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе»*. Дзейнасць Заслаўскага гісторыка-археалагічнага запаведніка (1967), Гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» (1986). Рэстаўрацыйныя работы (1967–1990).

Структура музея-запаведніка, аб’екты: музейна-выставачны комплекс, этнаграфічны комплекс «Млын», Дзіцячы музей міфалогіі і лесу, Музей-дот, музей «Гандлёвая лаўка», Музей беларускай маляванкі, гарадзішча «Замэчак», гарадзішча «Вал» і былы кальвінскі збор, касцёл нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

Асноўныя кірункі дзейнасці, музейныя калекцыі.

*Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж»* (1993). Рэстаўрацыйныя работы. Адкрыццё для наведвальнікаў першага пускавога комплекса (2008 г.). Адкрыццё другога пускавога комплекса (2012 г.).

Структура музея-запаведніка, аб’екты: палацава-паркавы ансамбль, ратуша, касцёл Божага Цела, Слуцкая брама.

Асноўныя кірункі дзейнасці, музейныя калекцыі.

*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.* Структура музея-запаведніка, аб’екты: Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора (1987 г.); Краязнаўчы музей (новая экспазіцыя існуе з 1986 г.); Музей беларускага кнігадрукавання (1990 г.); Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага (1994 г.); Музей баявой славы (1985 г.); Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З. М. Тусналобавай-Марчанка (1987 г.); Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я (1998 г.); Стацыянарная выстава «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай» (1998 г.); Мастацкая галерэя (2002 г.); Дзіцячы музей (2004 г.); Прыродна-экалагічны музей (2005 г.).

Асноўныя кірункі дзейнасці, музейныя калекцыі.

*Музей «Замкавы комплекс «Мір».* Пачатак рэстаўрацыйных работ (1983 г.). Філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР (1987 г.). Дэкрэт Урада БССР «О статусе Мирского замка как историко-культурной ценности национального значения» (1988 г.). Новы праект рэстаўрацыі замка (1989 г.).

Адкрыццё першай музейнай экспазіцыі ў паўднёва-заходняй вежы (1992 г.). Уключэнне замкавага комплекса ў Спіс аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЭСКА (2000 г.). Адкрыццё замкавага комплекса «Мір» пасля рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ (2010 г.). Атрыманне статуса самастойнага музея (2011 г.).

Асноўныя кірункі дзейнасці, музейныя калекцыі.

Тэма 9 Музеі гісторыі гарадоў

Музеі гісторыі гарадоў у Беларусі: агульны агляд і спецыфіка дзейнасці.

*Музей гісторыі горада Мінска*. Спробы стварэння музея ў 1920-я і ў 1980-90-я гг. Стварэнне рабочай групы ў 2003 г., рашэнне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта аб стварэнні Музея гісторыі горада Мінска (2010). Канцэпцыя па музеефікацыі гарадскога асяроддзя.

Асноўныя калекцыі. Падраздзяленні ў структуры музея: Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага (2012 г.), Гарадская мастацкая галерэя твораў Л.Д.Шчамялёва (2003 г., у структуры музея з 2010 г., новая экспазіцыя – з 2015 г.), Майстэрня-музей народнага мастака Беларусі Івана Міско (2011 г.), Мінская гарадская ратуша (2012 г.), экспазіцыя «Карэтная» (2014 г.), Музей «Лошыцкая сядзіба» і прысядзібны флігель у Лошыцкім сядзібна-паркавым комплексе (2015 г.), Арт-гасцёўня «Высокае места» (2015 г.), экспазіцыя «Мінская конная чыгунка» (2017 г.), экспазіцыя «Мінск. Верхні горад. Археалагічны музей» (2019 г .), Выставачныя залы на вул. Ракаўскай (2022 г.), Мемарыяльны музей-майстрэрня З.І. Азгура (2025 г.).

*Музей гісторыі і культуры горада Наваполацка*. Стварэнне на грамадскіх пачатках (1968 г.), сучасная назва музея (1998 г.). Развіццё музея паралельна з развіццём горада.

Асноўныя калекцыі і кірункі дзейнасці.

*Музей гісторыі горада Брэста.* Заснаванне (1990 г.) і адкрыццё для наведвання (1998 г.) ў якасці філіяла Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, з 2007 г. – перададзены ў падпарадкаванне аддзела культуры Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта.

Асноўныя калекцыі і кірункі дзейнасці.

*Музей гісторыі горада Магілёва.* Заснаванне (1990 г.) і адкрыццё для наведвання (2002 г.) у будынку гарадской ратушы. Асноўная місія музея – прэзентацыя Магдэбургскай эпохі ў гісторыі горада і краіны.

Асноўныя калекцыі і кірункі дзейнасці.

*Музей гісторыі горада Гомеля (2009 г.)*.

Асноўныя калекцыі і кірункі дзейнасці. Філіял: Музей друку і фатаграфіі (2015 г.).

Музеі горада, якія з’яўляюцца філіяламі іншых музеяў: Музей гісторыі і культуры горада Оршы (1992 г.), Давыд-Гарадоцкі музей гісторыі горада (2018 г.).

Тэма 10 Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. Этнаграфічныя музеі і турысцкія комплексы

Гісторыя *Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту*.

Крытэрыі выбару месца для музея (унікальны геаграфічны ланшафт, помнік геалагічнай гісторыі, памятная гістарычная мясціна). Заснаванне музея (1976).

Накірункі работы па стварэнні музея (выяўленне, збор і ўлік помнікаў, распрацоўка навуковай канцэпцыі, стварэнне праэкта генеральнага плана музея на падставе гісторыка-этнаграфічнага раяніравання матэрыяльнай культуры Беларусі). Структурная аснова музея. Сектары – Цэнтральная Беларусь, Падняпроў’е, Паазер’е. «Мястэчка» і «Драўляная гарадская забудова». Правядзенне народных святаў на тэрыторыі музея.

Калекцыі музея.

Музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» (1999). Асноўныя кірункі дзейнасці.

Мотальскі музей народнай творчасці (1995). Асноўныя кірункі дзейнасці.

Музейны комплекс старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі» (1994). Асноўныя аб’екты і кірункі дзейнасці.

Музейны комплекс «Дукорскі маёнтак». Асноўныя аб’екты і кірункі дзейнасці.

Іншыя этнаграфічныя музеі і турысцкія комплексы.

Тэма 11 Мастацкія музеі

Сетка мастацкіх музеяў Беларусі. Агульны агляд.

Гісторыя *Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.* Адкрыццё Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР (1939). Спыненне дзейнасці і страты галерэі пад час Вялікай Айчыннай вайны.

Аднаўленне работы Дзяржаўнай мастацкай галерэі (1944). Адкрыццё галерэі для наведвальнікаў (1946). Стварэнне першай сталай экспазіцыі (1947). Адкрыццё новага музейнага будынка (1957). Перайменаванне Дзяржаўнай мастацкай галерэі ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР (1957). Накіраванасць музея на збор класікі айчыннага мастацтва. Дзейнасць М.П. Міхалапа, А.В. Аладавай і Ю.А. Карачуна. У. І. Пракапцова.

Аддзелы музея. Навукова-даследчая і навукова-асветніцкая работа музея. Выставачная дзейнасць музея. Выданне музеем навуковых каталогаў.

Наданне музею новай назвы – Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (1993).

Калекцыі музея – беларускага сучаснага жывапісу і скульптуры, народнага мастацтва, старажытнабеларускай пластыкі XVI–XVIII стст.,

іканапісу XVI–XX стст., рускага жывапісу і скульптуры XVIII–XX стст., заходнееўрапейскага жывапісу, старадрукаў і інш.

Сучасная экспазіцыя музея.

Філіялы музея – Музей беларускага народнага мастацтва /д. Раўбічы Мінскі р-н/ (1977), Музей В.К. Бялыніцкага-Бірулі /г. Магілеў/ (1978), Дом-музей Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст. /г. Мінск/ (1984).

Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь (2015). Гісторыя стварэння, калекцыі, асноўныя кірункі дзейнасці.

Рэгіянальныя мастацкія музеі.

Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва (1998). Асноўныя кірункі дзейнасці. Калекцыі музея. Філіялы музея.

Музей Марка Шагала ў Віцебску. Дом-музей Марка Шагала (1997), Арт-цэнтр Марка Шагала (1992). Калекцыі музея.

